Tom 12 • 2012 ACTA ALBARUTHENICA ISSN 1898-8091

**Алена Коршук**
Мінск

# АДЗІНСТВА ЧАЛАВЕКА І ПРЫРОДЫ ЯК ХАРАКТЭРНАЯ РЫСА БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

„І чаго зямля так сумна
Познай восенню, зімой?
І чаму прыветна, шумна
І так весела вясной?
Бо яна, відаць, штось знае,
Бо яна жыве, дзядок.
Ўсё жыве і душу мае:
Краска, дрэва і жучок...”[1]

У гэтым урыўку з паэмы *Сымон-музыка* Якуб Колас поўна і глыбока раскрывае шматвяковыя ўзаемаадносіны беларуса і навакольнай прыроды. Праз дзесяць стагоддзяў хрысціянства пранёс народ упэўненасць у тым, што нават самая маленькая расліна надзеленая душой:

„Ты прыгледзься добра к ім...
Ці не праўда, як не схожа
Адно дзерава з другім?
Тая хвоя, што пры полі,
Бач, стаіць як важны пан,
Разгарнуўшы на прыволлі
Свае лапы, бы каптан;
А другая, небарака,
Пахілілася наніз,
Стан пагнуўся, як кульбака,
І верх жудасна абвіс.
А чаму? У іх дзве долі –
Лёс няроўнага жыцця...”[2]

Так у невялікім вершаваным урыўку тлумачыцца іерархічная структура беларускага грамадства тых гадоў.

Як сведчаць пісьмовыя крыніцы розных стагоддзяў і фальклор, прырода для беларуса заўсёды была і крыніцай сілы, і прытулкам, і надзейнай абаронай.

Вывучэнне прэцэдэнтных мастацкіх тэкстаў XVI–XXI стст. і сістэмнае прымяненне тэарэтычнай базы даследавання дазваляюць пацвердзіць, што антрапапрыроднае адзінства з’яўляецца адной з базавых характарыстык беларускай культуры.

---

[1] Я. К о л а с, *Сымон-музыка*, ч. 1 [online], http://knihi.com/Jakub_Kolas/Symon-muzyka.html [доступ: 20.11.2012].

[2] *Ibidem*.

Вопыт вывучэння беларускай культуры, назапашаны прадстаўнікамі розных галін ведаў[3], дазваляе прапанаваць гіпотэзу аб якаснай канстантнасці ключавых каштоўнасцяў, якія выяўляюцца па метадзе каштоўнасных арыентацый Ф. Клакхан і Ф. Стробдэка (VOM – Value orientation method)[4]. Аўтары лічаць, што мадэль культуры, якая складаецца з адмысловага спалучэння пэўных каштоўнасцяў, перакананняў і нормаў паводзін, фарміруецца ў залежнасці ад таго, як пераважная большасць прадстаўнікоў культуры адказваюць на пяць пытанняў вельмі глыбокага, глабальнага характару. А менавіта:

1. Якая сутнасць чалавека: ён добры, дрэнны, нейтральны, ці можа ён змяняцца на працягу жыцця;
2. Як чалавек успрымае прыроду: ён яе ўладар, жыве ў гармоніі з ёй або цалкам ёй падпарадкаваны;
3. Што больш значнае – мінулае, сучаснасць або будучыня;
4. Чым матываваная дзейнасць чалавека – патрэбай паказаць сябе, змяняць прыроду на сваю карысць, развіваць сябе;
5. Як трэба ўзаемадзейнічаць адзін з адным – быць у групе на роўных правах, падпарадкоўвацца аўтарытэту ці жыць цалкам незалежна?

Па параметры каштоўнаснай арыентацыі

> „Суадносіны чалавека і навакольнага асяроддзя (аўтары метаду прапаноўваюць тры варыянты, а менавіта: чалавек – валадар Прыроды, ён жыве ў гармоніі з прыродай, ці цалкам ёй падпарадкаваны)”[5]

беларусы арыентуюцца на прадстаўленне аб неабходнасці гарманічнага існавання з прыродай, а таксама прызнаюць яе часам прадвызначальную сілу над чалавекам.

Непрадказальныя ўмовы надвор'я і адсутнасць прамой залежнасці дабрабыту ад укладзеных у працу намаганняў становяцца фактарамі, якія вядуць да дэізацыі прыроды і звышнатуральных (чытай: непазнаных прыродных) сіл. А гэта спрыяе фарміраванню ў беларусаў паважнага стаўлення да навакольнага асяроддзя, да прызнання яго значнасці і ўздзеяння на жыццё чалавека.

---

[3] Гл.: О. А б р а м о в а, *Специфика белорусской ментальности и ее влияние на политический выбор в Республике Беларусь*, „Вестник аналитики” 2004, № 1; І. А б д з і р а л о в і ч, *Адвечным шляхам. Дасьледзіны беларускага сьветапогляду*, Мінск 1993, 43 с.; А.Л. Б у р б и с, *Приложение к Докладной записке о создании образцовой Белорусской Советской Республики. Москва, 14 января 1921 г.* [в:] В.К. К о р ш у к [и др.], *Государственность Беларуси. Проблемы формирования в программах политических партий*, Минск 1999, с. 125–141; Э.С. Д у б я н е ц к і, *Менталітэт беларусаў. Спроба гісторыка-псіхалагічнага аналізу*, „Беларусіка-Albaruthenica” 1993, кн. 2, Мінск, с. 192–201; Н. Е ф и м о в а, *Средства массовой информации и проблема национально-культурного возрождения*, „Белоруссия и Россия: общества и государства” 1998, вып. 2, Москва, с. 153–18; В.В. К и р и е н к о, *Bewteen Polska and Rossia* [в:] Е.В. К о р ш у к, *Основы межкультурного общения*, Минск 2003, с. 29–34; В. Н о с е в и ч, *Белорусы. Становление этноса и „национальная идея”*, „Белоруссия и Россия: общества и государства” 1998, вып. 2, Москва, с. 11–31; Л. Т и т а р е н к о, *Национальные особенности и гендерная специфика формирования идентичности белорусов в условиях постсоветской трансформации*, Минск 2006, с. 30–45; Ю.В. Ч е р н я в с к а я, *Белорус: штрихи к автопортрету. Этнический самообраз белоруса в сказках*, Минск 2006, 256 с.; Ю.В. Ч е р н я в с к а я, *Народная культура и национальные традиции. Учебно-методическое пособие*, Минск 1998, с. 62–64.

[4] F.R. K l u c k h o h n, F.L. S t r o d t b e c k, *Variations in Value Orientations*, Evanstones 1961.

[5] Цыт. па F.R. K l u c k h o h n, F.L. S t r o d t b e c k, *op. cit.*, p. 259.

Дадатковымі фактарамі з'яўляюцца ўваходжанне населеных беларусамі тэрыторый у вялікія дзяржаўныя адзінкі, існаванне ў рамках асобнага „роднага кута", які амаль не мае патрэбы ў сувязях з іншымі „кутамі", адсутнасць магчымасці і патрэбы ў заваёвах новых тэрыторый. Калі перамяшчэнні на іншыя землі немагчымыя, у народа ёсць два шляхі забеспячэння жыццядзейнасці: інтэнсіўны, які прадугледжвае пастаянную распрацоўку і ўдасканаленне тэхналогій прыродакарыстання ў самым шырокім сэнсе (які абралі такія культуры, як шведы і фіны) і экстэнсіўны, спалучаны з мінімізацыяй патрэбаў з аднаго боку і эканомным выкарыстаннем прыродных рэсурсаў з другога (якому аддаюць перавагу беларусы). Нават калі сабраны ўраджай пераўзыходзіць усе чаканні, практычна не бывае рэпартажаў СМІ, дзе не рабілася б агаворка або спасылка на „цяжкія ўмовы надвор'я".

Зыходзячы з наяўнасці сур'ёзнага даследавання ў галіне анталогіі беларускай экалагічнай думкі, праведзенага на папярэдніх этапах НДР, і апублікаванага ў *Анталогіі экалагічнай думкі. Усходнія славяне*[6], заснаванага на творах XVI–XX стагоддзяў, для аналізу мастацкай літаратуры былі адабраны тэксты беларускіх аўтараў другой паловы XX – пачатку XXI стагоддзяў. Падставай для выбару стала ўключэнне менавіта дадзеных аўтараў у праграму вывучэння беларускай літаратуры ў сярэдняй школе з аднаго боку і папулярнасць у чытачоў (паводле колькасці прададзеных кніг) з другога.

Такім чынам, былі прааналізаваны:

1. Алесь Наварыч, *Літоўскі воўк*;
2. Георгій Марчук, *Кветкі правінцыі*;
3. Святлана Алексіевіч, *Зачараваныя смерцю*;
4. Вершы Раісы Баравіковай;
5. Наталля Батракова, *Тэрыторыя душы. Кніга 1*.

Падчас аналізу літаратурных твораў верыфікаваліся наступныя гіпотэзы, вылучаныя на падставе аналізу мастацкіх і фальклорных твораў больш ранняга перыяду:

1. Беларус не аддзяляе сябе ад прыроды, прычым менавіта ад прыроды „роднага кута". Як пісаў у паэме *Новая зямля* Я. Колас, „Зямля дзяцей сваіх ня кіне"[7], беларус чэрпае сілу ў роднай зямлі.
2. Беларусам уласціва ідэнтыфікаваць чалавека і прыродныя элементы, надзяляць яго ўласцівасцямі жывёл і раслін. Такая характарыстыка адрознівае і іншыя ўсходнеславянскія культуры. У беларусаў і рускіх да блізкага ці прыемнага чалавека часта ласкава звяртаюцца „зайка, кацяня, рыбка і да т.п." У іншых еўрапейскіх культурах ў падобных мэтах часцей за ўсё выкарыстоўваюцца неадушаўлёныя прадметы (параўн. амерыканскае „булачка", „гарбузік" ці французскае „цукерачка") і максімум адзін прадстаўнік жывёльнага свету. Напрыклад, у палякаў гэта „медзведзяня", у румынаў – „птушаня", у італьянцаў – „верабейка". У культур, якія прызнаюць уладу прыроды над чалавекам, выкарыстанне найменняў прадстаўнікоў фауны ў імёнах людзей сустракаецца досыць часта. Успомнім хоць бы Зоркага Сокала, Вялікага Змея і да іх падобных.

---

[6] *Антология экологической мысли. Восточные славяне*, под ред. А.И. З е л е н к о в а, Минск 2003, с. 3.

[7] Я. К о л а с, *op. cit.*

3. У беларускай культуры адбываецца надзяленне раслін і жывёл якасцямі чалавека. Паказальнай з гэтага пункту гледжання, напрыклад, з'яўляецца рэклама мінскага заапарка, якая прайшла нядаўна на тэлебачанні: „Мінскі заапарк ад усёй душы віншуе дэльфінаў Дыяну і Пашу з нараджэннем чароўнага дэльфіняці.... Сардэчна вітаем, малеча!". Наўрад ці падобнае віншаванне было б магчымым нават у самых экалагічна скіраваных культурах.
4. Да прыроды варта ставіцца з павагай, браць у яе толькі самае неабходнае. Яшчэ Мікола Гусоўскі згадваў аб фактычна прыродаахоўных звычаях і законах. Вуллі дзікіх пчол варта не руйнаваць, а „частавацца мёдам", саміх жа пчол не разганяць, а прыручаць[8]. Зуброў ж знішчаць было забаронена пад страхам суровага пакарання[9].
5. Прырода і яе звышнатуральныя сілы больш значныя, чым воля чалавека. І сёння, нават не ўсведамляючы гэтага, беларусы ўшаноўваюць багіні ўраджаю Талаку. Так, у Брэсцкай вобласці дзяўчаты павінны зжаць першы сноп, які гаспадар ўпрыгожвае і ставіць ў чырвоны кут да наступнага ўраджаю.

Усе здагадкі цалкам пацвердзіліся. У мастацкіх творах раманнага жанру (*Літоўскі воўк*, *Кветкі правінцыі*) і ў вершаваных творах (вершы Раісы Баравіковай) прысутнічаюць усе элементы. У жанры інтэрв'ю (*Зачараваныя смерцю*) больш відавочна прасочваецца надзяленне чалавека ўласцівасцямі прыроды і прыроды – чалавечымі якасцямі. У меншай ступені гэтыя параметры беларускай культуры адлюстраваліся ў дэтэктыве (*Тэрыторыя душы*), дзе значна больш увагі надаецца міжасобасным адносінам герояў.

Найбольш ярка ў сучаснай мастацкай літаратуры прасочваецца атаясамленне чалавека і прыроды, надзяленне жывёл, раслін, з'яў прыроды і чалавека падобнымі якасцямі.

Сам выбар назвы для гістарычнага рамана, прысвечанага перыяду паўстання пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага, – *Літоўскі воўк* з'яўляецца адметным. Падабраны ў лесе, прыручаны воўк уцёк ад нядобрых людзей, апынуўся па іх віне за кратамі і помсціць ім за гэта. Яго дзеянні і нават думкі апісваюцца той жа мовай, якая выкарыстоўваецца для людзей–герояў твора:

> „Пан, пасаджаны ў клетку, пагрыз аднаму ваўку лапу. Так цапнуў, што кіпцюры ў шэрага адскочылі. Як магло здарыцца, што ў звярынцы не дапільнавалі крыважэрнага чалавечыска і дапусцілі да беднага ваўка? У ранішні шпацыр воўк далучыўся да паджарых маладых *ваўчыц, якія пазіралі на пана ў клетцы*. Воўк быў таксама малады – пад'ярак. Насіў крацястыя панталоны, меў доўгі нос, кончык якога вісеў, бы кропля вадкасці. *З нейкай невядомай прычыны маладому ваўку захацелася пагладзіць пана ў клетцы*. Пад'ярак прасунуў лапу за прэнты, а пан і цапнуў дурня зубалямі"[10].

Больш за тое, воўк надзяляецца і ўласцівай беларусу любоўю да роднага краю:

---

8 *Антология...*, с. 142.

9 *Ibidem*, p. 141.

10 А. Н а в а р ы ч, *Літоўскі воўк* [online], http://www.knihi.com/Ales_Navaryc/Litouski_vouk.html [доступ: 10.08.2012].

> „І вось цяпер, калі наноў *пацвердзілася, што край мілотны ўсё-ткі ёсць* і, мала таго, з таго краю прыехалі, аказаліся тут гэтыя во людзі, насычаныя роднымі пахамі, якія прабіваліся праз іхныя ўласныя цялесныя воні, пакута вярнулася, запульсавала надзеяй, трывогай: а мо яшчэ воля магчымая, *а мо яшчэ можна ўцячы, вызваліцца ад жалезных кратаў, пабегчы з усіх чатырох лапаў туды, да роднага, мілага, сціхотнага*”[11].

Сама прырода, па-першае, патрабуе павагі, як і чалавек:

> „Некалькі разоў кабыла тузала вазок наперад, потым спынілася. Настаўнік перакруціўся ў вазку і з жахам убачыў, што кабылка стаіць па пуза ў вадзе. ..
> – Мы тонем! – разгублена прамовіў настаўнік. – А ты...
> – *Сядзі, пан, – выразна прамовіў Цімох, – калі па вухах пугай не зарабіў. Не бачыш, што Ліза робіць?*
> *Кабыла напраўду цурбоніла ў ваду*”[12].

З іншага боку, прырода (і звышнатуральныя сілы) мацнейшыя за чалавека. Так, ні ў якім разе не трэба было ехаць праз балоты, дзе нібы вадзіліся „ваўкалакі”. А месца, дзе вадзіліся незвычайныя птушкі, адкрыцца магло толькі бязгрэшнаму чалавеку:

> „Грэшны стаў, а грэшнаму не дадзена. Нікому не дадзена, а як пасвяцеюць людзі, то і адкрыецца месца, а пакуль, паночку, грашаць, то закрытае гэта месца, не відаць і знаку... – забалбатаў селянін”[13].

Закрытасць гэтага месца для людзей фактычна надае яму статус запаведніка.

Гэтак жа паказальным з’яўляецца і выбар назвы для рамана-мемуараў Г. Марчука *Кветкі правінцыі*.

Аўтар прама кажа пра сілу прыроды, пра бесперспектыўнасць спроб чалавека вяршэнстваваць над ёю:

> „...усё нам здаецца, што зможам працістаяць уладзе неба над намі, і ніяк нам не хочацца ўразумець, што не адолем мы яго ўладу... паспрабуй не пусці яблыню ў цвет, не дай бэзу распусціцца?”[14]

Гэты сучасны беларускі пісьменнік таксама надзяляе з’явы прыроды характарыстыкамі чалавека: „Настурцыі, якая, не пытаючыся дазволу ў гаспадароў, паўзе на вуліцу”, вербы ў яго „схілілі свае косы ў стаячую ваду”[15].

А чалавек атрымлівае мянушку „дзядзька Воўк”[16].

І гэты дзядзька Воўк не проста, а „з любоўю” „даглядаў” свой цуд-сад[17].

У культурах, дзе чалавек лічыць сябе ўладаром прыроды, ён карыстаецца ёю для задавальнення сваіх патрэбаў. Верагодней за ўсё, пра працу ў садзе было б

---

[11] *Ibidem.*
[12] *Ibidem.*
[13] *Ibidem.*
[14] Г. М а р ч у к, *Кветкі правінцыі* [online], www.knihi.com/Hieorhij_Marcuk/Kvietki_pravincyi.html [доступ: 10.08.2012].
[15] *Ibidem.*
[16] *Ibidem.*
[17] *Ibidem.*

сказана, што чалавек любіў займацца садам, г.зн. на пярэдні план выступае не любоў да сада, а асалода ад гэтага віду заняткаў. У адносінах да саду „любіць" азначала б „мне дастаўляе эстэтычнае задавальненне тое, што я бачу, чым магу займацца ў дадзеным месцы".

Не дзіўна, што элемент прыроды прысутнічае і ў назве зборніка вершаў Раісы Баравіковай *Пад небам першага спаткання*, бо для паэзіі згадванне прыроды лічыцца традыцыйным.

Паэтка кажа аб сваім адзінстве з прыродай, фактычна, надзяляючы яе душой:

„Упадзе ў траву пялёстак клейкі,
задрыжыць расінка на плячы, –
адгукнуся голасам жалейкі,
каб не сумавалася ўначы"[18].

Або:

„Я ж…пасаджу за стол месяц май"[19].

Сучасны чалавек, аўтар, тым не менш, не выключае магчымасці існавання прадстаўнікоў звышнатуральнага свету: „Сёння вечарам тут паселіцца можа, Ўдовін сын, мо вядзьмар"[20].

Больш за тое, яна прызнае сілу прыроды, вышэйшую за магчымасці чалавека (тым самым паказваючы знешні локус кантролю, уласцівы беларусам): „Чакаем навальніцы, ветру, грому, **маланку просім вузел рассячы**"[21].

Самае моцнае ўражанне ад пацверджання вылучаных гіпотэз стварае зборнік успамінаў людзей, якія спрабавалі здзейсніць самагубства, і членаў сем'яў тых, каму гэта ўдалося. Ізноў надзяленне з'яў прыроды ўласцівасцямі чалавека адлюстравана ўжо ў назве. Святлана Аляксеевіч назвала зборнік адрэдагаваных ўспамінаў *Зачараваныя смерцю*, быццам бы смерць можа кагосьці зачараваць.

У апавяданнях, напоўненых болем і пакутамі, чалавек не аддзяляецца ад прыроды: „…хоць бы адзін з нас на самай справе любіў. Кожны раз, як пасля дажджу… Чыста і нанава"[22].

Людзі злучаюцца ў галаве памерлай з жывёламі, падобна да кентаўраў: „А ўсе людзі мне падаюцца падобнымі на жывёлін: у гэтага галава – дзікага вепра, а ў гэтага – бабрыная"[23].

Пастулат аб адзінстве чалавека і прыроды перадаецца з пакалення ў пакаленне, культура ўзнаўляе сябе. Перад самагубствам маці тлумачыць сыну, што яна сыходзіць не назаўсёды, яна вернецца, падобна новаму коласу, які вырас з зерня. І маленькае дзіця спакойна такое тлумачэнне прымае. На спробу дарослых сказаць яму, што мама з'ехала, ён адказвае: „Няпраўда, маму закапалі. Яна прасіла: «Ты не бойся. Мяне, быццам зярнятка, закапаюць. Я ўзыду»"[24].

---

18 Р. Баравікова [online], www.knihi.com/Raisa_Baravikova [доступ: 10.08.2012].
19 *Ibidem*.
20 *Ibidem*.
21 *Ibidem*.
22 С. А л е к с і е в і ч, *Зачараваныя смерцю* [online], www.knihi.com/Sviatlana_Aleksijevic/Zacaravanyja_smierciu.html [доступ: 10.08.2012].
23 *Ibidem*.
24 *Ibidem*.

У некалькі меншай меры пытанні ўзаемаадносін чалавека з прыродай закранаюцца ў дэтэктыўным жанры, больш нацэленым на дзеянне. Тым не менш, па ўскосных паказчыках можна сцвярджаць, што дзеючыя асобы вераць у сілы прыроды. Напрыклад, хворых на прастуду герояў яшчэ да прыходу лекара лечаць малаком, мёдам, цяплом, а не антыбіётыкамі, што характэрна для культур, якія прызнаюць перавагу чалавека над прыродай, або замовамі, як у цалкам падпарадкаваных прыродзе тыпах менталітэту.

Адзіны параметр, які не прасочваецца ў сучаснай беларускай мастацкай літаратуры – гэта стаўленне да роднай зямлі, як да крыніцы сіл. Мабыць, гэта натуральны вынік урбанізацыі і паскарэння тэмпу жыцця.

Несумненна, для больш дакладнага аналізу асаблівасцяў сучаснага погляду беларускай культуры на суіснаванне прыроды і чалавека неабходны больш шырокія даследаванні, якія ахопліваюць розныя сферы жыцця. Аднак праведзены аналіз дазваляе сцвярджаць, што адзінства чалавека і прыроды з'яўляецца канстантай беларускай культуры і да сённяшняга дня захоўвае сваю значнасць.

*Elena Korshuk*

**The Unity of Man and Nature as a Salient Feature of Belarusian Culture**

A b s t r a c t

The author uses samples of modern Belarusian fiction to analyze the „Man-to-Nature" criterion of the F. Kluckhohn's and F. Strodbeck's Value Orientation Method. The results of the study favour the conclusion that the unity of Man and Nature is an intransient quality of Belarusian culture.